Скварцова І.М.

**Ураджэнцы Міра – працаўнікі радзівілаўскіх ткацкіх мануфактур**

У 1566 г. незадоўга да сваёй смерці Юрый ІІ Ф. Іллініч (каля 1535–каля 1569) завяшчаў Мірскі замак са шматлікімі маёнткамі сыну свайго былога апекуна Мікалаю Крыштофу Радзівілу Сіротку (1549–1616). І паводле гэтага завяшчання ў 1568 г. Мірскае графства, Зэльва і Дворышча (Лідскі павет), Чарнаўчыцы і Белая (Брэсцкае ваяводства) перайшлі ва ўласнасць Радзівілаў – аднаго з буйнейшых магнацкіх родаў (герб "Трубы" ("Тромбы")).

Прадстаўнікі радзівілаўскага роду ў XVI–XVIII стст. займалі вышэйшыя дзяржаўныя, адміністратыўныя і вайсковыя пасады і чыста з эканамічнага пункту гледжання маглі сабе дазволіць значныя траты на мецэнацкую дзейнасць. А як вядома, ужо да сярэдзіны XVII ст. працэс распаўсюджання мецэнацтва ахапіў амаль увесь заможны слой грамадства[1]. Яго моцна падштурхоўвала спаборніцтва паміж магнацкімі і каралеўскім дварамі, якое да пачатку XVIII ст. ператварылася ў сапраўдную барацьбу за тое, каб пераманіць да сябе лепшых мастакоў і рамеснікаў, сабраць найбагацейшую калекцыю, стварыць бібліятэку і г.д. Пашырэнню ідэй мецэнацтва спрыялі таксама цесныя сувязі з краінамі Заходняй Еўропы, што праявілася не толькі ў эканамічных, палітычных адносінах з рознымі дзяржавамі, навучанні моладзі за мяжой, але і ў актыўным засваенні еўрапейскай культуры і ладу жыцця.

Прадстаўнікі радзівілаўскай фаміліі шырока займаліся мастацкім мецэнацтвам і фундацыямі нацыянальнай прамысловасці з мэтай дасягнення незалежнасці сваіх рамёстваў ад імпарту з іншых краін, лічылі гэта гонарам, акрамя таго, поўнасцю забяспечвалі сябе высокакаштоўнымі творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Лічыцца, што менавіта з княжацкага роду Радзівілаў пайшла ініцыятыва адраджэння промыслаў і рамёстваў, падтрыманая іншымі магнацкімі родамі.

І ўжо ў першай палове XVII ст. Мір – важны цэнтр рамяства і гандлю, у дакументах згадваюцца рамеснікі 18 спецыяльнасцей, у канцы стагоддзя іх ужо 49.

У першай палове XVIII ст. у Міры працавалі палатняныя і суконныя мануфактуры [2].

А каля 1747 г. у Міры пачынае працаваць майстэрня па вытворчасці мастацкіх тканін – шпалер. Гэта было прадпрыемства, рэарганізаванае і пераведзенае з Белай Падляшскай.

Тры радзівілаўскія мануфактуры па вытворчасці мастацкіх тканін працавалі ў Белай Падляшскай яшчэ ў першай палове XVIII ст. дзякуючы фундацыям кароннай канцлерыны, жонкі Караля І Станіслава Радзівіла, Ганны Катажыны Радзівіл, народжанай Сангушкі (1676–1746). Першая майстэрня стала дзейнічаць каля 1720 г. Другая была заснавана каля 1727 г. А паміж 1728–1733 гг. (некаторыя крыніцы адносяць гэту дату да 1733–1737 гг.) пачало працаваць трэцяе тэкстыльнае прадпрыемства.

Майстэрні Ганны Радзівіл не зніклі пасля смерці сваёй заснавальніцы ў 1746 г. Апякунства над імі прыняў яе сын Міхаіл Казімір Радзівіл "Рыбанька".

На падставе рахункаў выплат[3] можна меркаваць, што паміж 1747 і 1750 гг. шпалерная майстэрня працавала ў Міры, і, больш таго, размяшчалася непасрэдна ў замку.

Каля 1750–1752 гг. прадпрыемства працуе ў Нясвіжы, а потым – прыкладна да 1792 г. – у Карэлічах. Пра яе паспяховую дзейнасць у 1786 г. згадвала "Гандлёвая газета", а ў 1792 г. яна ж шкадавала, што фабрыку зліквідавалі [4].

Дзякуючы нясвіжскім канцылярскім кнігам вядомы распарадак дня ў майстэрні, а таксама імёны жанчын-майстрых і некалькіх дзяўчат, якія павінны былі дапамагаць і адначасова вучыцца рамяству. У сувязі з тэматыкай канферэнцыі сярод майстрых асаблівую цікавасць выклікае імя **Тэрэсы Лютніцкай з Міра**, якая была жонкай мастака Казіміра Лютніцкага.

Правамерна меркаваць, што ўраджэнцы Міра былі задзейнічаны і на іншых радзівілаўскіх ткацкіх мануфактурах, у прыватнасці, на слуцкім прадпрыемстве па вытворчасці кунтушовых паясоў. Традыцыйна гісторыю работы мануфактуры падзяляюць на некалькі перыядаў, якім адпавядаюць своеасаблівыя меткі на паясах: 1) 1760 (1762) – 1776 г. – пачатковы слуцкі перыяд. Наладжваецца дзейнасць новага прадпрыемства, утворанага зліццём нясвіжскай і слуцкай персіярань першай паловы XVIII ст. Тканіны адзначаюцца меткамі: "Słuck"; "Me fecit / Słutiae"; "Me fecit / Słuciae"; 2) 1776–1780 г. – перыяд арэнды прадпрыемства Янам Маджарскім. Меткі ўжо не толькі гарадскія, але і імянныя: "Me fecit / Słuciae Ioannes Madzarski"; "Ioannes Madzarski"; 3) 1780–1807 г. – перыяд арэнды прадпрыемства Лявонам Маджарскім. Тканіны сігнатуюцца гарадскімі і імяннымі меткамі, напісанымі кірыліцай вялікімі літарамі: "СЛУЦК"; "ВЪ ГРАДЕ / СЛУЦКЕ"; "ЛЕО МА / ЖАРСКІЙ ВЪ ГРАДЕ / СЛУЦКЕ"; 4) 1807–1818 г. – дзейнасць мануфактуры пад наглядам радзівілаўскай Адміністрацыі. Меткі "СЛУЦК" або "Ф.К.С.Р. / СЛУЦК". Літары расшыфроўваюцца як "фабрыка княжаская скарбу радзівілаўскага"; 5) 1818–1846 г. – апошні перыяд дзейнасці персіярні, час яе заняпаду. Меткі толькі гарадскія.

На жаль, пераважна вельмі сціслыя архіўныя звесткі аб працаўніках мануфактуры не заўсёды даюць магчымасць устанавіць месца нараджэння майстроў ці іх памочнікаў і вучняў.

Зараз дакладна вядома імя толькі аднаго ўраджэнца Міра. Гэта **Фелікс Лянкевіч**. Паводле архіўных звестак, Радзівілаўская Адміністрацыя накіравала яго і яшчэ аднаго "хлопца" з Міра вучыцца ткацтву паясоў на слуцкую мануфактуру ў лютым 1842 г. У гэты час мануфактура арэндавалася габрэйкай Таўбай Поляк (або Паляковай ці Мардуховай). Дамова арэнды дзейнічала ў 1840–1846 гг. З ліста Таўбы вядома, што яна ўладкавала Лянкевіча і другога "хлопца" да "фабрыканта Йозафа" на навуку і на кватэру [AGAD, AR, dz. XIX, p. 47, sp. 15, k. 39].

Зараз складана дакладна ўстанавіць, хто менавіта навучаў Лянкевіча. Верагодней за ўсё, гэта быў або Йозаф Барсук, адмысловы ткацкі майстар, кіраўнік варштата [AGAD, AR, dz. XIX, p. 47, sp. 3, sp. 7, sp. 10], або Йозаф Ляшчынскі, які пачынаў як памочнік пры варштаце, а потым, удасканаліўшы сваё майстэрства (вядома, што Радзівілаўская Адміністрацыя выдаткоўвала для гэтага значныя грошы), стаў працаваць як ткач [AGAD, AR, dz. XIX, p. 47, sp. 15, k. 33-35].

З рапарта Ігнація Францкевіча да Галоўнага Упраўлення Маёнткамі вядома, што праз месяц пасля ўладкавання Лянкевіч збег назад у Мір [AGAD, AR, dz. XIX, p. 47, sp. 15, k. 44].

А ў верасні 1842 г. слуцкі адміністратар Kriegstein прапануе Галоўнаму Упраўленню Маёнткамі адаслаць Лянкевіча і другога “хлопца” з Міра ў Грозаў [Hrozów] (зараз у Копыльскім раёне), удасканаліць майстэрства вырабу палатна і абрусаў, матывуючы гэта тым, што на слуцкай фабрыцы, якая фактычна не працуе, яны вучыцца не могуць [AGAD, AR, dz. XIX, p. 47, sp. 15, k. 47].

У 1846 г. слуцкая мануфактура па вытворчасці кунтушовых паясоў – на гэты час апошняе радзівілаўскае тэкстыльнае прадпрыемства – канчаткова спыніла сваю працу і існаванне.

*Умоўныя скарачэнні*

AGAD – (Archiwum Glówne Akt Dawnych) – Галоўны архіў старажытных дакументаў (Варшава)

AR – (Archiwum Radziwiłłów) – архіў Радзівілаў